# ВОДЗЫЎ

навуковага кіраўніка аб дысертацыі
Дзінгілеўскай Алены Іванаўны
"Прыметнікі-паронімы ў беларускай літаратурнай мове:
сістэмныя адносіны і ўжыванне"
на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці
10.02.01 – беларуская мова

Дзінгілеўская Алена Іванаўна ў 2009 годзе скончыла ГрДУ імя Янкі Купалы па спецыяльнасці "Нямецкая мова. Англійская мова". У 2012 годзе скончыла магістратуру ГрДУ імя Янкі Купалы па спецыяльнасці "Германскія мовы". З 2020 па 2023 год навучалася на дзённай форме аспірантуры па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

З 01.09.2009 па 24.09.2009 года А. І. Дзінгілеўская працавала настаўнікам нямецкай мовы ў вучэбна-педагагічным комплексе "Рудаяварскі дзіцячы сад – сярэдняя агульнаадукацыйная школа". З 28.09.2009 па 29.03.2013 года працавала на кафедры замежных моў № 1 ГрДУ імя Янкі Купалы на пасадзе выкладчыка-стажора; з 2013 па 2022 год – выкладчыкам замежных моў на кафедры замежных моў ГрДУ імя Янкі Купалы. З 2022 года і па сённяшні час працуе старшым выкладчыкам кафедры замежных моў.

За час навучання і працы ва ўніверсітэце, а таксама ў працэсе навучання ў магістратуры і аспірантуры А. І. Дзінгілеўская няспынна ўдасканальвала ўменні і навыкі навукова-даследчай работы ў галіне лінгвістыкі. Праявіла сябе як самастойны, ініцыятыўны, мэтанакіраваны і адказны даследчык, здольны глыбока аналізаваць навуковы матэрыял, якасна рашаць пастаўленыя задачы. А. І. Дзінгілеўская паспяхова здала экзамены па ўсіх кандыдацкіх дысцыплінах. Навуковая кваліфікацыя Дзінгілеўскай Алены Іванаўны адпавядае патрабаванням, якія выстаўляюцца да саіскальнікаў вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

Кандыдацкая дысертацыя "Прыметнікі-паронімы ў беларускай літаратурнай мове: сістэмныя адносіны і ўжыванне" была выканана на кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы. Дысертацыйнае даследаванне адпавядае п. 6 пераліку прыярытэтных кірункаў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці на 2021–2025 гады, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.05.2020 № 156. Вынікі кваліфікацыйнай работы А. І. Дзінгілеўскай адносяцца да дэрываталогіі і лексікалогіі беларускай літаратурнай мовы і адлюстроўваюць заканамернасці ўстанаўлення семантычных (сінанімічных і паранімічных) адносін паміж прыметнікамі ў выпадках, калі яны ўтвараюцца суфіксальным спосабам ад адной асновы слова той ці іншай часціны мовы.

Мэтай дысертацыйнага даследавання з'яўляецца выяўленне словаўтваральнага патэнцыялу беларускай літаратурнай мовы ў частцы ўтварэння аб'яднанняў аднаасноўных суфіксальных ад'ектыўных дэрыватаў і сістэматызацыя апошніх на аснове вызначэння характару семантычных і стылістычных адносін паміж імі. Для дасягнення пастаўленай мэты рашаліся наступныя задачы даследавання:

1) выявіць склад прыметнікаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы, утвораных суфіксальным спосабам ад адной асновы, і размеркаваць іх па парах і шматкампанентных аб'яднаннях;

2) вызначыць характар семантычных адносін (сінанімічныя, паранімічныя або сінанімічна-паранімічныя) паміж аднаасноўнымі прыметнікамі ў парах і шматкампанентных аб'яднаннях на аснове ацэнкі іх першасных значэнняў;

3) акрэсліць склад і характар элементаў плана зместу лексемы, якім можа быць нададзены статус самастойных лексіка-семантычных варыянтаў слова;

4) вызначыць, як уплываюць зыходныя адносіны (сінанімічныя або паранімічныя) у пары аднаасноўных прыметнікаў на колькасць другасных значэнняў, якія ў іх могуць развівацца, а таксама ў якой залежнасці знаходзіцца магчымасць захавання зыходных адносін у пары ад колькасці другасных значэнняў, якія развіваюць яе складнікі;

5) устанавіць склад і ролю розных спосабаў і сродкаў дыферэнцыяцыі плана выражэння аднаасноўных суфіксальных ад'ектыўных дэрыватаў.

Дысертацыя А. І. Дзінгілеўскай складаецца з пераліку скарачэнняў і ўмоўных абазначэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў з вывадамі па кожнай з іх, заключэння, спіса выкарыстанай літаратуры, які ўключае бібліяграфічны спіс (129 пазіцый) і спіс публікацый саіскальніка вучонай ступені (18 пазіцый), 8 дадаткаў. Ва ўводзінах абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы дысертацыі, яе навізна, асвятляецца ступень распрацаванасці пытанняў адносна даследанняў прыметнікаў, утвораных ад адной утваральнай асновы ў працах айчынных і замежных лінгвістаў. У агульнай характарыстыцы работы акрэсліваецца сувязь дысертацыі з навукова-даследчай тэмай, вызначаецца мэта, задачы, аб'ект і прадмет даследавання, яго навуковая навізна, фармулююцца палажэнні, якія выносяцца на абарону, падаюцца звесткі пра ўклад саіскальніка вучонай ступені, апрабацыю і апублікаванасць вынікаў дысертацыі, яе структуру і аб'ём. У трох главах раскрываюцца асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання. Выклад матэрыялу ў дысертацыі праведзены лагічна і паслядоўна. Атрыманыя вынікі характарызуюцца навуковай навізной, аргументаванасцю, зробленыя высновы цалкам абгрунтаваны.

Праведзенае даследаванне мае як тэарэтычны, так і практычны характар. Яго палажэнні могуць быць выкарыстаны пры далейшым навуковым вывучэнні прыметнікаў беларускай літаратурнай мовы, распрацоўцы праблем словаўтваральнай сінаніміі і параніміі. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў навучальным працэсе ўстаноў вышэйшай адукацыі пры падрыхтоўцы лекцыйных курсаў па лексікалогіі і словаўтварэнні, пры распрацоўцы тэматыкі курсавых і дыпломных работ. Фактычны матэрыял можа быць выкарыстаны пры складанні слоўнікаў сінонімаў і паронімаў беларускай мовы.

Вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 18 навуковых работах: 5 артыкулах у навуковых часопісах, уключаных у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйнага даследавання; 7 артыкулах у зборніках навуковых прац; 6 публікацыях у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый. Усе публікацыі выкананы саіскальнікам без суаўтараў.

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі прайшлі апрабацыю на 6 навуковых канферэнцыях.

Лічу, што Дзінгілеўская Алена Іванаўна заслугоўвае прысуджэння ёй вучонай ступені кандыдата філалагічных навук за наступныя вынікі:

– раскрыццё словаўтваральнага патэнцыялу беларускай літаратурнай мовы ў галіне суфіксальнага ўтварэння ад’ектыўнай лексікі праз выяўленне здольнасці прыметнікаў пры ўтварэнні ад адной асновы слоў розных часцін мовы фарміраваць сінанімічныя і паранімічныя пары, а таксама сінанімічныя, паранімічныя і сінанімічна-паранімічныя аб’яднанні з трох, чатырох, пяці, шасці і сямі ўтварэнняў;

– выяўленне схільнасці аднаасноўных суфіксальных прыметнікаў пры ўтварэнні як пар, так і шматкампанентных аб’яднанняў (у праекцыі на агульны аб’ём адных і другіх) да ўстанаўлення ў іх складзе сінанімічных і паранімічных адносін у амаль роўнай прапорцыі;

– абгрунтаванне мэтазгоднасці надання статусу асобнага лексіка-семантычнага варыянта лексемы элементам семантычнай структуры слова, якія ў тлумачальных слоўніках падаюцца як канкрэтызацыя асноўнага значэння або яго адценне;

– устанаўленне заканамернасцей, якімі суправаджаецца развіццё другасных значэнняў у парах аднаасноўных суфіксальных прыметнікаў: па-першае, калі прыметнікі ў пары паводле сваіх першасных значэнняў знаходзяцца ў сінанімічных адносінах, яны маюць схільнасць развіваць аднолькавую колькасць значэнняў; і наадварот, калі прыметнікі паводле першасных значэнняў з’яўляюцца паронімамі, яны выяўляюць схільнасць да дысбалансу пры параўнанні аб’ёму іх семантыкі; па-другое, для пар, у якіх аднаасноўныя прыметнікі паводле свайго першаснага значэння з’яўляюцца сінонімамі, вельмі істотнае значэнне ў плане магчымасці захавання імі зыходных сінанімічных адносін мае тое, ці развіваюць яны аднолькавую колькасць другасных значэнняў, ці гэта колькасць будзе для іх хоць бы мінімальна рознай;

– вызначэнне комплексу спосабаў дыферэнцыяцыі плана выражэння аднаасноўных суфіксальных ад’ектыўных дэрыватаў, асноўным з якіх з’яўляецца задзейнічанне розных суфіксаў, а да дапаможных адносяцца: адрозненне ў месцы націску, супрацьпастаўленасць поўнай і скарочанай утваральнай асновы, наяўнасць / адсутнасць чаргаванняў ва ўтваральнай аснове, удзел / няўдзел інтэрфікса, супрацьпастаўленасць кароткай і поўнай формы прыметніка.

Навуковы кіраўнік
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт, дацэнт кафедры
беларускай філалогіі
29.05.2026

В. Л. Варановіч

ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела управления персоналом
учреждения образования «Гродненский
государственный университет имени Янки Купалы»
С.В. Нестерович
29.05.2026 г.